■ Надвор'е

# Нас чакаюць цёплыя выхадныя

**Як паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя, сёння па поўдні краіны чакаецца да 25 градусаў цяпла.**



Будзе пераменная воблачнасць, пераважна без ападкаў, толькі ў асобных раёнах па паўночным усходзе пройдуць кароткачасовыя дажджы. Вецер прагназуецца паўночна-заходні. Тэмпература паветра ўначы складзе 6—12 градусаў цяпла, на ўсходзе — да 14 са знакам плюс. Удзень сіноптыкі абяцаюць 17—23 градусы, па поўдні краіны — да 25 градусаў.

У суботу, 10 чэрвеня, прагназуецца добрае надвор'е, пераважна без ападкаў. Толькі ўдзень па захадзе краіны могуць прайсці кароткачасовыя дажджы, якія абумовіць перасоўванне атмасфернага фронту з тэрыторыі Польшчы. Тэмпература ўначы — ад 6 да 13 градусаў цяпла, удзень чакаецца 20—26 вышэй за нуль.

У нядзелю, 11 чэрвеня, у асобных раёнах пад уплывам атмасфернага фронту пройдуць кароткачасовыя дажджы. Ноччу тэмпература паветра будзе трымацца на ўзроўні ад 8 да 14 градусаў цяпла, днём ртутны слупок падымецца да 19—25 градусаў.

Надвор'е пачатку наступнага тыдня вызначыць атмасферны фронт з паўночна-заходніх раёнаў Еўропы. Ноччу па поўначы, удзень у паўночна-заходняй палове краіны пройдуць дажджы, магчымы навальніцы. Што да тэмпературнага фону, дык уначы будзе ад 9 да 16 градусаў цяпла, удзень паветра прагрэецца да 20—27 градусаў.

Згодна з папярэднімі прагнозамі, няўстойлівае надвор'е пратрымаецца да сярэдзіны наступнага тыдня.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ

## ЭКАЛАГІЧНЫЯ, ПАТРЫЯТЫЧНЫЯ, АДУКАЦЫЙНЫЯ...

**Да паслуг юных жыхароў Магілёўскай вобласці будзе працаваць больш за 700 аздараўленчых лагераў на любы густ.**

У іх ліку 20 кругласутачных стацыянарных загарадных баз адпачынку, 4 з якіх размяшчаюцца на пляцоўках санаторна-курортных арганізацый. У сярэднім пуцёўка сюды каштуе каля 400 рублёў. Але ёсць варыянты як больш танныя, так і даражэйшыя. Напрыклад, адпачыць амаль тры тыдні ў лагеры «Дубравенка» ад Магілёўскага аддзялення Беларускай чыгункі абыдзецца больш чым у 570 рублёў.

Акрамя гэтага ў вобласці будуць працаваць больш за 500 лагераў дзённай формы, больш за 100 кругласутачных профільных лагераў 9-дзённага знаходжання (гэта экалагічныя, ваенна-патрыятычныя і іншай тэматыкі) і каля 100 лагераў працы і адпачынку для падлеткаў ад 14 да 18 гадоў. З наступнага тыдня расчыніць дзверы лагер «Алімпіец» для пераможцаў 2, 3 і заключнага этапаў рэспубліканскіх алімпіяд. Разумнікі будуць адначасова адпачываць і рыхтавацца да чарговых перамог.

— Органамі ўлады і ўласнікамі летніх загарадных аздараўленчых лагераў праведзены сур'ёзныя падрыхтоўчыя работы, — адзначыў **намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Андрэй КУНЦЭВІЧ.** — Толькі на патанненне пуцёвак для дзяцей супрацоўнікаў бюджэтных арганізацый, дзяцей-сірот, з шматдзетных сямей з абласнога бюджэту выдаткавана каля 713 тысяч рублёў. На ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы аздараўленчых лагераў накіравана з розных крыніц 750 тысяч рублёў.

Чакаецца, што за час канікул аздараўленне ў лагерах адпачынку пройдзе каля 42 тысяч дзяцей Магілёўшчыны.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

## НА МКАД — НОВЫЯ КАМЕРЫ ФОТАФІКСАЦЫІ

**На Мінскай кальцавой аўтамабільнай дарозе запрацуюць новыя стацыянарныя камеры фотафіксацыі, паведамілі ва УДАІ ГУУС Мінгарвыканкама.**

Гаворка ідзе пра датчык кантролю хуткасці на Мінскай кальцавой аўтамабільнай дарозе км 4 + 750 (унутранае кальцо); датчык кантролю хуткасці км 12 + 500 (унутранае і вонкавае кальцо); датчык км 29 + 100 (унутранае і вонкавае кальцо); датчык кантролю хуткасці на Мінскай кальцавой аўтамабільнай дарозе км 36 + 600 (унутранае кальцо).

Парушэнне хуткаснага рэжыму — адна з асноўных прычын дарожна-транспартных здарэнняў у Мінску, нагадалі ва УДАІ. Сталічная Дзяржаўтаінспекцыя рэкамендуе кіроўцам захоўваць хуткасны рэжым.

## ВАРВАРСКАЯ «РЫБАЛКА» КАЛЯ ГЭС

**Воўпаўскае вадасховішча на рацэ Рось у Воўпаўскай ГЭС стала месцам варварскай здабычы рыбы, якая прыходзіць сюды на нераст з Нёмана.**

— Мясцовыя жыхары заўважылі, што пры пераключэнні турбіны ГЭС узровень вады моцна паніжаецца прыкладна на дзесяць хвілін. Некалькі мужчын вырашылі гэтым скарыстацца, каб налавіць рыбы, — расказалі пра здарэнне ў Дзяржінспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету. — Узброіўшыся палкамі, браканьеры глушылі буйныя асобіны рыбы і выкідвалі іх на бераг. Траіх парушальнікаў за незаконнай здабычай затрымалі работнікі Ваўкавыскай міжрайінспекцыі, папярэдне зафіксаваўшы іх дзеянні на відэа ў якасці доказу віны.

Аднаму з парушальнікаў давядзецца пакрыць больш за 200 рублёў за кілаграмовага ляшча, другому — больш за 400 рублёў за сазана, а трэцяму — амаль 900 рублёў за тры асобіны буйной рыбы. Апроч таго, усім траім будзе прызначаны штраф за незаконнае рыбалоўства — да 50 базавых велічынь (1150 рублёў).

## ВОСЬ ТАКІЯ ДЭМБЕЛЬСКІЯ «ГУЛЬНІ»...

**У сталіцы сустрэча колішніх саслужыўцаў скончылася крымінальнай справай: затрыманы падазраваны ва ўгоне матацыкла.**

Па інфармацыі Першамайскага РУУС г. Мінска, пасля нядаўняй дэмабілізацыі вырашылі сустрэцца колішнія саслужыўцы. Вядома, адзначылі гэтую справу. Пасля адна частка хлопцаў раз'ехалася па дамах, а другая вырашыла працягнуць свята. На шляху ў краму адзін з дэмбеляў заўважыў на ўзбочыне матацыкл і надумаў на ім пракаціцца. Не заводзячы «жалезнага каня», малады чалавек проста адштурхнуўся нагамі ад зямлі і паехаў. Аднак не справіўся з кіраваннем і ўпаў. Пасля гэтага здарэння хлопец кінуў матацыкл і пайшоў далей. Каля крамы ўжо іншы малады чалавек вырашыў пракаціцца на... асфальтаўкладчыку, які стаяў побач. Пацягаўшы за рычагі, машыну з месца ён так і не зрушыў. Далей на шляху дэмбеляў з'явіўся «Запарожац», які быў адчынены. На шчасце, завесці машыну ў кампаніі не атрымалася. У адносінах да 20-гадовага беспрацоўнага мінчаніна заведзена крымінальная справа за ўгон матацыкла, яму пагражае пазбаўленне волі тэрмінам да пяці гадоў. Па астатніх фактах праводзіцца праверка.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# Толькі з параднага ўвахода

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Сёння гучыць шмат супярэчлівых меркаванняў наконт фармату правядзення прыёмнай кампаніі, што склаўся ў апошнія гады. Хтосьці кажа, што, можа, трэба вярнуцца да ранейшай формы экзаменаў, без цэнтралізаванага тэсціравання, без дзяржкамісіі. Але чаго хаваць, раней далёка не заўсёды вырашальнымі для залічэння ў кола студэнтаў станавіліся веды абітурыента, здаралася, што ў ход ішлі фінансавыя магчымасці і сувязі іх бацькоў. Магчыма, калі-небудзь патрэба ў жорсткім кантролі за прыёмнай кампаніяй адпадзе сама сабой, але пакуль што наша грамадства да гэтага яшчэ не падрыхтаванае, — падкрэсліў Леанід Анфімаў.

У рабоце дзяржкамісіі па краіне будзе задзейнічана каля 200 работнікаў Камітэта дзяржкантролю. Яны адсочваюць выкананне заканадаўства пры правядзенні ўступнай кампаніі ў вышэйшых і сярэдніх спецыяльных установах Беларусі на ўсіх этапах. Цэнтралізаванае тэсціраванне, якое стартуе праз некалькі дзён, — толькі першы этап. На другім этапе дзяржаўная камісія будзе кантраляваць працэс падачы дакументаў, падрыхтоўку і правядзенне экзаменаў унутры ВНУ і залічэнне абітурыентаў у студэнты.

Абсалютна ва ўсіх установах адукацыі будуць працаваць камісіі па кантролі за ходам уступных выпрабаванняў. Старшынямі гэтых камісій з'яўляюцца члены дзяржкамісіі, а намеснікамі — супрацоўнікі органаў Камітэта дзяржаўнага кантролю.

— Любыя спробы паступіць у ВНУ з чорнага ўвахода павінны быць спынены, — папярэджвае **старшыня Дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступных іспытаў у вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах, намеснік прэм'ер-міністра Васіль ЖАРКО.** — Сярод абітурыентаў і іх бацькоў, на жаль, ёсць тыя, хто спрабуе абысці закон і робіць гэта не без дапамогі членаў прыёмных камісій. Таму наша агульная задача — не пакінуць ім ніякіх шанцаў... Уступныя выпрабаванні ў кожнай без выключэння ўстанове адукацыі, незалежна ад формы іх правядзення, павінны прайсці спакойна, арганізавана, у добразычлівай абстаноўцы, а працэдура залічэння — галосна і дэмакратычна. Абітурыенты павінны быць упэўнены: пропускам у ВНУ з'яўляецца толькі ўзровень іх ведаў.

Экзамены, якія праводзяцца непасрэдна ў ВНУ, напрыклад, па той жа творчасці, не пазбаўлены суб'ектывізму, і з гэтай прычыны патрабуюць асаблівай увагі. Таму трэба быць гатовымі да таго, што дзяржаўная камісія можа прапанаваць у апошні момант не толькі свае варыянты экзаменацыйных заданняў, але і рэзервовы састаў экзаменацыйнай камісіі. Такое права ў дзяржкамісіі ёсць.

**Міністр адукацыі Ігар КАРПЕНКА** праінфармаваў пра наваўвядзенні, што чакаюць прыёмную кампанію: гэта магчымасць здаваць чатыры тэсты замест трох, падаўжэнне дзеяння сертыфікатаў ЦТ на два гады, з'яўленне трох рэзервовых дзён для здачы тэстаў абітурыентамі, якія прапусцілі экзамен па ўважлівай прычыне. Дарэчы, чатыры тэсты будуць здаваць каля 40 працэнтаў ад агульнай колькасці тых, хто прайшоў рэгістрацыю. У сувязі з увядзеннем чацвёртай дысцыпліны на ЦТ і трох рэзервовых дзён замест аднаго, які быў раней, **тэрміны пачатку прыёму дакументаў на бюджэтную форму навучання пасунуліся на чатыры дні.** Прыёмныя камісіі будуць прымаць у абітурыентаў дакументы з 12 па 17 ліпеня (летась прыём дакументаў на «бюджэт» распачынаўся 8 ліпеня).

Таксама былі ўнесены карэктывы ў Парадак арганізацыі і правядзення цэнтралізаванага тэсціравання. Напрыклад, **падрабязна рэгламентавана магчымасць выхаду з экзаменацыйнай аўдыторыі падчас здачы ЦТ.** Абітурыенты змогуць выходзіць з аўдыторыі па ўважлівай прычыне (дрэннае самаадчуванне, фізіялагічныя патрэбы і інш.) толькі ў суправаджэнні арганізатара, які забяспечвае правядзенне цэнтралізаванага тэсціравання па-за аўдыторыяй. Пры выхадзе абітурыент пакідае экзаменацыйныя матэрыялы і лісты для рабочых запісаў на сваім працоўным месцы ў аўдыторыі побач з дакументам, які сведчыць яго асобу. Адказны арганізатар перад гэтым у прысутнасці абітурыента правярае камплектнасць пакінутых ім экзаменацыйных матэрыялаў. Час знаходжання абітурыента па-за аўдыторыяй уключаецца ў агульны час праходжання цэнтралізаванага тэсціравання па вучэбным прадмеце, гэта значыць, што ніхто не будзе персанальна падаўжаць экзамен для асобна ўзятага чалавека. Аб гэтым абітурыент павінны быць папярэджаны загадзя, да выхаду з аўдыторыі, каб узважыць усе «за» і «супраць». Факт выхаду за межы аўдыторыі фіксуецца адказнымі арганізатарамі ў пратаколе правядзення цэнтралізаванага тэсціравання.

Ігар Карпенка паведаміў, што па даручэнні ўрада была створана рабочая група, якая прааналізавала тэсты рэпетыцыйнага тэсціравання на прадмет іх адпаведнасці вучэбным праграмам агульнай сярэдняй адукацыі. Па выніках праверкі былі ўнесены нязначныя карэкціроўкі.

Старшыня дзяржкамісіі Васіль Жарко паабяцаў, што пасля завяршэння прыёмнай кампаніі, усе тэсты яшчэ раз падвергнуцца грунтоўнаму аналізу. «Яны павінны адпавядаць праграме сярэдняй школы, каб на сто балаў тэст маглі здаць не толькі ліцэісты і гімназісты, але і выпускнікі звычайнай сярэдняй школы. І не звяртацца пры гэтым да паслуг рэпетытараў. Каб усе знаходзіліся ў роўных умовах», — патлумачыў ён.

Васіль Жарко таксама лічыць патрэбным прааналізаваць сістэму шкаліравання балаў на ЦТ. «Карэляцыя паміж ацэнкамі ў атэстаце і вынікамі на ЦТ павінна быць працэнтаў на 70—80, — падзяліўся старшыня дзяржкамісіі сваім меркаваннем. — Калі сярэдні бал атэстата выпускнікоў па краіне — 7 балаў, а па выніках цэнтралізаванага тэсціравання — 4,7, то ўзнікаюць пытанні. Або школы завышаюць адзнакі, або тэсты вінаватыя?..»

**Па словах намесніка прэм'ер-міністра, будзе праведзены разгорнуты аналіз уступнай кампаніі 2017 года, па выніках якога плануецца выпрацаваць прапановы па ўнясенні змяненняў у Правілы прыёму ва ўстановы адукацыі і прадставіць іх на разгляд кіраўніку дзяржавы да першага верасня.**

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

**Тэлефоны «гарачай лініі» Дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам уступных іспытаў «Абітурыент 2017»**

| | | |
|---|---|---|
| Рабочая група дзяржаўнай камісіі ў Мінску (Камітэт дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь) | (8 017) | 327 66 80 |
| Брэсцкая абласная камісія (Камітэт дзяржаўнага кантролю Брэсцкай вобласці) | (8 0162) | 21 18 76, 21 18 94 |
| Віцебская абласная камісія (Камітэт дзяржаўнага кантролю Віцебскай вобласці) | (8 0212) | 42 61 93, 42 61 82 |
| Гомельская абласная камісія (Камітэт дзяржаўнага кантролю Гомельскай вобласці) | (8 0232) | 23 83 85 |
| Гродзенская абласная камісія (Камітэт дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці) | (8 0152) | 79 88 01, 79 88 40, 79 88 16 |
| Магілёўская абласная камісія (Камітэт дзяржаўнага кантролю Магілёўскай вобласці) | (8 0222) | 22 18 97, 31 06 04 |
| Мінская абласная камісія (Камітэт дзяржаўнага кантролю Мінскай вобласці) | (8 017) | 331 66 02, 284 09 06 |
| «Гарачая лінія» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь | (8 017) | 222 43 12 |